Прывесці моладзь да Бога праз асабісты прыклад

Аўтар: Кінга Красіцкая
04.03.2018 00:00



Моладзь у касцёле “Гуляйце, скачыце, бегайце, шуміце. Для мяне важна толькі адно: каб вы не грашылі”. З гэтымі словамі звяртаўся да сваіх выхаванцаў св. Ян Боско – заснавальнік салезіянскай супольнасці. Такога дэвіза прытрымліваюцца таксама ў араторыі св. Яна Боско пры парафіі св. Міхала Арханёла ў Смаргоні, дзе вядзецца праца з дзецьмі і моладдзю. Некалькі разоў на тыдзень дзесяткі мясцовых маладых жыхароў збіраюцца ў салезіянскім моладзевым цэнтры, каб з малітвай і адарацыяй, святам і весялосцю, спартыўнымі баталіямі і творчымі вечарамі бавіць вольны час. У гэтым наведвальнікам дапамагаюць аніматары, служэнне якіх заключаецца ў добрасумленным выкананні штодзённых абавязкаў, ахвярнасці, радасці, што паходзіць ад чыстага сумлення і лучнасці з Панам.

Хто такія аніматары?

Кл. Марк Найдзіч SDB, адказны за араторый св. Яна Боско ў Смаргоні, распавядае, што падрыхтоўка аніматараў у салезіянскім цэнтры вядзецца ўжо не адзін год. Яны працуюць у харызме Дона Боско, а галоўная мэта іх служэння – пастаянная прысутнасць сярод дзяцей і моладзі, евангелізацыя і сведчанне сапраўднай хрысціянскай радасці. †



“Гісторыю аніматарства ў Смаргоні можна адлічваць ад моманту адкрыцця араторыя ў 2004 годзе, – гаворыць кл. Марк. – ***Спачатку маладыя людзі збіраліся самі па сабе, па суботах рыхтавалі вечары, спартыўныя спаборніцтвы, адарацыі Найсвяцейшага Сакраманту. Адным словам, шукалі шляхі і магчымасці, каб запоўніць вольны час. З 2008–2009 гадоў пачалася больш сур’ёзная фармацыя будучых аніматараў. Сярод хлопцаў і дзяўчат шукалі тых, хто спрытнейшы, інтэлектуальна развіты, прытрымліваецца маральных прынцыпаў і гатовы ўзяць***

на сябе адказнасць за выхаванне іншых. 13-гадовыя падлеткі пачыналі праходзіць адмысловую міні-школу аніматарства, вучыліся быць памочнікамі. Гэтая падрыхтоўка трывала 2 гады: памочнікі знаёміліся з асобай кс. Боско, вучыліся адказваць за дзіцячы араторый, бавіць час з дзецьмі, якія прыходзілі ў цэнтр пасля св. Імшы. Ладзілі для іх забавы, святы, забаўляльныя імпрэзы".

Той, хто годна праходзіў гэтае выпрабаванне, складаў адмысловыя абяцанні і пераходзіў на наступную ступень – кандыдата ў аніматары. ***"У сваю чаргу шлях ад кандыдата да аніматара таксама займае прыкладна 2 гады. Каб падняцца на вышэйшую ступень, трэба праявіць сябе, прадэманстраваць свае здольнасці, уменні. І тут усё залежыць выключна ад канкрэтнага чалавека і яго актыўнасці,*** – тлумачыць кл. Марк. –

У працэсе падрыхтоўкі кандыдаты прымаюць удзел у фармацыйных сустрэчах, паглыбляюць разуменне салезіянскага вучэння, сваю духоўную сталасць, узрастаюць у аніматарскім пакліканні. Калі бачым, што кандыдат з'яўляецца добрым хрысціянінам, з якога ў духоўным плане можна браць прыклад, што ён сапраўды гатовы бескарысліва ахвяраваць свой час і сваё сэрца дзеля іншых, шчыра прагне стаць на гэты валанцёрскі шлях і пайсці па ім, прымаем яго ў аніматары".

Кл. Марк падкрэслівае, што кандыдаты і аніматары – "душа араторыя". Яны прыходзяць сюды не толькі, каб ім карыстацца, але і для таго, каб праяўляць сваю любоў у адносінах да іншай асобы, даваць нешта ад сябе, чымсьці дзяліцца.

"Аніматарства базуецца на ўзаемнай інтэграцыі 3-ох асноўных аспектаў: розуму, веры і любові. Тут можна правесці аналогію са свечкай, у якой воск – гэта розум. Ён дае форму, выразнасць. Кнот – гэта вера, цэнтральны элемент, унутраны стрыжань, без якога траціцца сэнс. А полымя – любоў, без якой нічога не мае сэнсу. Аніматарства з'яўляецца змаганнем не толькі за іншага чалавека, але і за самога сябе, пераадольваннем уласных бар'ераў і комплексаў. Яно дапамагае вучыцца любіць сябе і іншых", – падсумоўвае адказны за араторый.

Не толькі забаўляць, але выхоўваць

С. Дар'я Еўтухоўская FMA, адна за арганізатарак працы смаргонскага араторыя, адзначае, што на дадзены момант кандыдаты і аніматары – гэта, у асноўным, старэйшая моладзь: вучні выпускных класаў або студэнты. Кожны тыдзень яны рыхтуюць забаўляльныя вечары ды іншыя цікавыя мерапрыемствы для наведвальнікаў араторыя.

"Субота і нядзеля – найбольш загружаныя дні, калі збіраецца шмат моладзі. Сярод нашых гасцей як практыкуючыя католікі, так і дзеці ды моладзь, далёкія ад веры і святыні, – распавядае с. Дар'я. – ***Аніматары арганізоўваюць для іх кінапрагляды, спартыўныя спаборніцтвы, гульні. Неад'емнай часткай такіх сустрэч з'яўляецца малітва. Таксама аніматары звяртаюцца да ўдзельнікаў сустрэчы са «слоўкам» – кароценькім павучаннем. «Слоўка» не абавязкова звязана з пытаннямі веры, яно можа мець нейкі выхаваўчы аспект, закранаць пэўныя маральнаэтычныя пытанні. Паколькі зараз перыяд Вялікага посту, то акцэнтуем увагу на Евангеллі, цытуем выбраныя ўрыўкі, над якімі пазней разважаем. Гэта робіцца дзеля таго, каб, пакідаючы араторый, малады чалавек мог над чымсьці задумацца, нешта прааналізаваць".***

С. Дар'я таксама падкрэслівае, што задача аніматараў – не толькі забаўляць, але і

выхоўваюць. ***“Нашыя аніматары радасныя. Яны «здабываюць» сэрцы наведвальнікаў араторыя, бо з чуласцю акружаюць іх апекай і любоўю, не шкадуюць лішні раз сказаць добрае слова ці ўсміхнуцца. Яны таксама на ўласным прыкладзе паказваюць, што жыць з Богам у сэрцы – гэта прыгожа. Штодня дэманструюць сваімі паводзінамі, што хрысціянскія прынцыпы, пра якія часта гаворыцца падчас сустрэч у араторыі, з’яўляюцца не пустымі словамі, а фундаментам, на якім базуецца жыццё сапраўднага салезіянскага аніматара. Св. Ян Боско хацеў выхаваць маладых людзей, каб яны былі добрымі хрысціянамі, сумленнымі грамадзянамі і шчаслівымі жыхарамі Неба. Нашыя аніматары таксама кіруюцца гэтым жаданнем у сваім служэнні”.***

Марта Адахоўская

Я наведвала араторый з самага маленства. Назірала і захаплялася, якой надзвычайнай энергі
Лічу, што галоўнае правіла аніматара – быць ініцыятыўным, не баяцца выйсці насустрач Богу і

Аліна Арцюкевіч

Кожны, хто з’яўляецца аніматарам, хоча ахвяраваць сябе і свой час дзеля моладзі і дзяцей, як
Шмат маладых людзей у сучасным свеце з’яўляюцца нібыта пакінутымі. Часта ім не хапае баць

Караліна Сняжко

Аніматарства – гэта не праца, а пакліканне. Аніматар – той, хто можа аддаць сваё жыццё для
Праз фармацыю і старанную працу мы становімся тымі, хто жыве ў еднасці з Богам і ў каго на

Міхаіл Дудко

Салезіянскі аніматар – гэта чалавек дзеяння, які не сядзіць на месцы, ідзе наперад і вядзе за
Аніматарства шмат у чым мне дапамагло: я пазбавіўся пэўных комплексаў, навучыўся правільна

Юлія Забельская

У нашай камандзе не можа быць “я”, ёсць толькі “мы”, бо разам працуем дзеля агульнага выні
Аніматарства цікавае для мяне тым, што я магу пазнаёміцца з новымі людзьмі, пазнаць іх унутр

Кацярына Цялега

Зараз я з’яўляюся кандыдатам у аніматары. У нас сапраўдная салезіянская сям’я, дзе мы прав
Дзякуючы аніматарскай актыўнасці маё акружэнне змянілася ў лепшы бок. Я знайшла новых с